■ Людзі і лёсы

МЕЛОДЫЯ ДЛЯ БАЯНА

Як хлопец з беларускай глыбінкі заснаваў кафедру ў кансерваторыі і міжнародны фестываль

Пётр Гаварушка — чалавек мінулага стагоддзя і краіны, якая распалася. Дзе і калі яшчэ такое было магчыма? Нарадзіцца 90 гадоў таму ў сялянскай сям'і ў Беларусі сёмым па ліку дзіцем. Закончыць жыццё ў горадзе, які назвалі культурнай сталіцай Расіі, перажыўшы на 6 гадоў краіну, грамадзянінам якой быў тры чвэрці стагоддзя.

Яго малая радзіма — вёска Чырвоны Бераг Жлобінскага раёна Гомельскай вобласці. На беразе ціхай рэчкі Добысны раскінуўся маляўнічы парк. У цэнтры яго — старадаўні замак. Пасля рэвалюцыі тут размясцілі сельскагаспадарчы тэхнікум. Вучыцца ў ім — сапраўдная мроя мясцовай моладзі. І Пецю Гаварушку, магчыма, прызначана было стаць аграномам або ветэрынарам. Але лёс распарадзіўся інакш.

Сельскі хлопец вывучыўся іграць на старэнькім гармоніку самастойна, ледзьве не ўпотай. Інструмент быў не яго — старэйшага брата Андрэя. Іграць хацелася суткі напралёт: у клубе на танцах, на вясковым вяселлі — любая нагода была б дарэчы. Калі ў 1936-м па суседстве ішлі ваенныя вучэнні, даў «сольны» канцэрт для чырвонаармейцаў. Камандзіру часці так спадабалася выступленне вясковага хлапчука, што ён напісаў ліст у маскоўскую газету: маўляў, хлопцу трэба дапамагчы — гэта сапраўдны самародак. «Комсомольская правда» не засталася безуважнай. У вёску Чырвоны Бераг прыйшло накіраванне на падрыхтоўчае аддзяленне ў Мінскае музычнае вучылішча. І зноў нечаканы паварот. Андрэй, які скончыў ваеннае вучылішча і пачынаў афіцэрскую службу ў Ленінградзе, выклікаў Пятра да сябе. Браты Гаварушкі пайшлі ў кансерваторыю на праслухоўванне да самога рэктара Паўла Серабракова. Пасля чаго знакаміты музыкант распарадзіўся: залічыць хлопца ў вучылішча пры кансерваторыі, пасяліць у інтэрнаце, выдаць баян для заняткаў.

Вайна пачалася за тры тыдні да яго 18-годдзя. Замест арміі ўзялі ў канцэртную брыгаду. Студэнты-музыканты іграліна прызыўных пунктах. Пад баян развітваліся і абіхалі вярнуцца жывымі. Неўзабаве іграліўжо для яго: паўналетні Пётр Гаварушка стаў байцом 4-й дывізіі Народнага апалчэння.

Былі цяжкія баі на подступах да Ленінграда. Зімой 1941–1942 гадоў ён служыў у роце баявой аховы, якая суправаджала машыны з боепрыпасамі цераз Ладагу па «Дарозе жыцця». Зіма была жудаснай: не да музыкі. Але аднойчы стары баян аказаўся ў руках, і Гаварушка вырашыў парадаваць сваіх калег. Гучалі народныя песні, класіка. Іграў салдат натхнёна і радасна, як калісьці для землякоў у роднай вёсцы. Разам з байцамі яго слухаў палонны немец, якога везлі ў штаб палка. Ён пазнаў мелодыю Баха, усміхнуўся і вымавіў назву горада — Клінгенталь.

Ва Усурыйску і ў Сцерлітамаку, у Якуціі і Херсоне, які стаў нечакана замежжам, у гарадах і вёсках роднай для яго Беларусі, у Прыбалтыцы, Балгарыі і Швецыі вучыліся іграць па яго дапаможніках. Ён быў шчаслівы.

Праз 30 гадоў Пётр Іванавіч будзе ў гэтым гарадку, знакамітым на ўвесь свет фабрыкай акардэонаў «Weltmeister». Тут будуць выступаць яго студэнты, заваюючы самыя прэстыжныя ўзнагароды. Зімой 1941-га гэта не магло нават прысніцца …

Летам 1942-га ў часцях Ленінградскага флоту аб'явілі агляд самадзейнасці. Яфрэйтара Гаварушку, пераможцу, адкамандзіравалі ў франтавы ансамбль. Спачатку — у ансамбль Неўскай аператыўнай групы, потым — 67-й арміі. 5–7 выступленняў на дзень: шпіталі, зямлянкі, акопы. Пад Шлісельбургам паранілі. Выжыў. Вайну скончыў у Курляндыі. Вярнуўся ў Ленінград з баявымі ўзнагародамі. Пачынаць прыйшлося з нуля. Чатыры ваенныя гады не палічылі нават за адзін вучэбны курс.

Вучылішча скончыў з адзнакай. Пачаў выкладаць. Паралельна — музычная школа. Для выканаўцы-народніка тады, у 1950-я гады, была адзіная магчымасць вучыцца далей, атрымліваючы вышэйшую музычную адукацыю ў Маскве, у музычна-педагагічным вучылішчы імя Гнесіных.

Дарэчы, прафесійнае навучанне выканаўцаў на баяне пачалося ў 1927 годзе. Пасля вайны інструмент набыў велізарную папулярнасць. Класы баяна (як і аркестры баяністаў) ствараліся ў музычных школах па ўсёй краіне. У 1960-я паўстала пытанне: патрэбны спецыялісты з вышэйшай адукацыяй. У Ленінградскай кансерваторыі адкрылі першую ў краіне кафедру народных інструментаў. Пётр Гаварушка стаяў ля яе вытокаў, быў сярод тых, хто фарміраваў метадычныя прынцыпы выканальніцкай школы. Яму было чым дзяліцца: выкладчыцкі вопыт, дырыжорская практыка (шмат гадоў заставаўся мастацкім кіраўніком аркестра баяністаў Выбаргскага Палаца культуры г. Ленінграда).

Патрэбны былі дапаможнікі, вучэбная літаратура. Пётр Іванавіч пісаў іх начамі на пяціметровай кухні «хрушчоўкі». Заснуць дзеці, сціхне тэлефон. Надыходзіў яго час. Створана звыш 50 метадычных, рэпертуарных зборнікаў для выдавецтваў «Музыка», «Савецкі кампазітар». «Школа ігры на баяне» вытрымала сем выданняў. Гэта — кніга для ўсіх, хто ўзяў у рукі баян у любым узросце. Агульны тыраж работ прафесара Гаварушкі — амаль 2 мільёны асобнікаў. Ён ездзіў з майстар-класамі па краіне, узначальваў журы ўсесаюзных, рэспубліканскіх, абласных конкурсаў баяністаў, удзельнічаў у канферэнцыях. Прыйшоўшы ў кансерваторыю ў 1960-м, у 1964-м узначаліў кафедру народных інструментаў. Восем гадоў — прарэктар па вучэбнай рабоце. Не адзін год працаваў плячо ў плячо з рэктарам, народным артыстам СССР Уладзіславам Чарнушэнкам. У 1978-м яму прысвоілі званне заслужанага дзеяча мастацтваў Расіі. За гэтыя гады кафедрай народных інструментаў было падрыхтавана 500 музыкантаў. Многія сталі ўладальнікамі самых прэстыжных узнагарод.

Апошняе яго «дзецішча» — міжнародны фестываль выканаўцаў на народных інструментах «Балтыка-гармоніка». Ён задумаў яго ў сярэдзіне 1990-х. Не лепшы быў час для падобных пачынанняў. Нейкім цудам задума ажыццявілася. Давялося біць на канцэртах самага першага фестывалю. У той час на ўсю моц грымела слава «бандыцкага Пецярбурга». Па вечарах нават на Неўскім праспекце было нешматлюдна. Транспарт працаваў з перабоямі. А ў асабняку барона фон Дэрвіза на Галернай вуліцы глыбокай ноччу гучала народная музыка. Столькі радасных твараў у смутныя, няўсмешлівыя 1990-я больш нідзе бачыць не даводзілася, прызнаюся шчыра: гэта было сапраўднае свята аднадумцаў.

У апошні вечар фестывалю Гаварушка выйшаў аб'явіць імёны пераможцаў. Усе ўсталі. Авацыі доўжыліся паўгадзіны, не менш. А пасля гала-канцэрта пераможцы выстраіліся ў чаргу па аўтографы. Высветлілася, што ва Усурыйску і ў Сцерлітамаку, у Якуціі і Херсоне, які стаў нечакана замежжам, у гарадах і вёсках роднай для яго Беларусі, у Прыбалтыцы, Балгарыі і Швецыі вучыліся іграць па яго дапаможніках. Ён быў шчаслівы.

«Балтыку-гармоніку» яшчэ некалькі гадоў праводзілі яго аднадумцы, назвалі іменем Пятра Гаварушкі. У пачатку новага стагоддзя перайменавалі ў «Петрапаўлаўскія асамблеі». Чаму? Тлумачэнне простае. Пётр — імя Гаварушкі. Павел — гэта Павел Смірноў — віртуоз-выканаўца, заслужаны артыст Расіі. Яго імя носіць і сёння аркестр баяністаў Камітэта па адукацыі ўрада Санкт-Пецярбурга. Разам яны стварылі знакамітую ленінградскую-пецярбургскую выканальніцкую школу, якая спалучыла лепшыя традыцыі народнай музыкі з дасягненнямі акадэмічнага выканання.

У Ленінградскай кансерваторыі адкрылі першую ў краіне кафедру народных інструментаў. Пётр Гаварушка стаяў ля яе вытокаў, быў сярод тых, хто фарміраваў метадычныя прынцыпы выканальніцкай школы.

Дзіўны быў фестываль! Дэмакратычны: хлапчукі-баяністы выступалі ў сваёй групе, віртуозы-лаўрэаты і народныя артысты — у сваёй. Без узроставых абмежаванняў. Выступалі салісты, ансамблі, аркестры. Нязменныя патрабаванні да рэпертуару — разам з народнымі мелодыямі выконваць творы сусветнай класікі. У праграме былі прадстаўлены ўсе віды гармонікаў — любімы ў народзе баян, папулярны ў Еўропе акардэон; а яшчэ губныя гармонікі, канцэрціна, банданеон — на ім ігралі мелодыі аргенцінца П'яцолы. Геаграфія гэтых конкурсаў уражвала тады, уражвае і сёння. Расія — 72 гарады. Былы Савецкі Саюз. Сярод іх і пасланцы Беларусі. А ўсяго 18 краін — ад Іспаніі да Кітая.



Набраў у пошукавіку назву «Балтыка-гармоніка», каб даведацца, які сёння яго лёс. Фестываляў было сем. Цяпер, відаць, паўза. З цяжкасцямі змагацца можна было. З цэнамі рынку, відаць, не атрымалася. Энтузіязмам і любоўю да мастацтва іх не адолееш… Веру, дзецішча Пятра Гаварушкі адродзіцца. Цікавасць да народных інструментаў ёсць. І ў Расіі, і ў Беларусі. На кафедры народных інструментаў сёння вучацца студэнты не толькі з еўрапейскіх краін, але і з Кітая, Паўднёвай Карэі. Іх вучаць па методыцы Гаварушкі. Выканальніцкія традыцыі жывыя. Вось нядаўняя навіна. Другі адкрыты гарадскі фестываль юных выканаўцаў на народных інструментах імя П. І. Гаварушкі прайшоў вясной 2014 года ў канцэртных залах Санкт-Пецярбурга. У фестывалі бралі ўдзел 126 дзяцей і падлеткаў з 36 навучальных установ. Гучалі баян, домра, балалайка, гуслі звончатыя. Усе ўдзельнікі былі адзначаны граматамі з іменем Пятра Гаварушкі. Мелодыя для баяна, якую асвоіў у вёсцы на Гомельшчыне беларускі хлопец, якую ён, стаўшы прафесарам, здолеў за паўстагоддзя ўзняць на сусветны ўзровень прафесійнага мастацтва, што патрабуе ад выканаўцы яркай індывідуальнасці, мастацкай выразнасці, высокага майстэрства, працягвае жыць і сёння.

Мансур АРЫФУЛІН

■ ПраСПОРТ

УСЯГО ТОЛЬКІ НІЧЫЯ

Беларусы стартавалі ў адборы да чэмпіянату Еўропы з нічыёй у матчы з Люксембургам (1:1)

Нават складана апісаць, што здарылася з камандай Георгія Кандрацьева на люксембургскім стадыёне «Жозі Бартэль». Тое, што там адбылося, дазволіла Жанатану Жуберу, галкіперу сціплай зборнай Вялікага Герцагства, пасля сустрэчы прызнацца: «Шкада, што не здолелі давесці да перамогі матч з камандай, якая дакладна не выглядала лепш за нас».

Так, за апошнія гады зборная Люксембурга значна «падрасла». Цяпер за зборную гуляюць ужо дзевяць прафесіяналаў, а не адзін Джэф Штрасэр, як гэта было на працягу многіх гадоў. Нягледзячы на гэта, калі зборная Беларусі хоча гуляць у фінальных стадыях чэмпіянатаў свету і Еўропы, яна мусіць «трушчыць» падобныя каманды, як арэшкі, і не ствараць з іх для сябе невырашальныя шарады. А ў матчы з «люксамі» ўсё ледзь не атрымалася наадварот. На выходзе 20-й хвіліны беларусы маглі чатыры разы распачынаць матч з цэнтра поля. У выніку яны гэта зрабілі на 42-й хвіліне, калі мяч за спіну Гутару адправіў Ларс Герсан. Беларусы, безумоўна, лік у другой палове зраўнялі. Але, што такое 1:1 у матчы з Люксембургам?! Для балельшчыкаў застаюцца два варыянты развіцця падзей: быць апантаным аптымістам і верыць, што гэта і сапраўды выпадковасць, ці бачыць у гэтым выніку сённяшні ўзровень нашай дружыны.

Эдгар Аляхновіч у акружэнні сапернікаў.

Фота bff.by

Георгій Кандрацьеў, галоўны трэнер зборнай Беларусі:

— Прыехалі за трыма баламі, а таму вынікам я не магу быць задаволеным. Першыя гульні заўжды цяжкія. Сапернік добра настроіўся. Шалёная самаддача. Мы дрэнна кантралявалі мяч. Момантаў у нас хапала, але не забываем з тых становішчаў, з якіх павінны забіваць.

Люк Хольц, галоўны трэнер зборнай Люксембурга:

— Я мяркую, што гледачы ўбачылі цікавае і відовішчнае супрацьстаянне. Мая каманда правяла фантастычны першы тайм. Страцілі некалькі магчымасцяў. Маглі забіваць двойчы і тройчы. У другой палове нам не хапала вопытных футбалістаў, каб супакоіць гульню. Мне вельмі цяжка перадаць свае эмоцыі. Аднак мы ўсцешаныя тым, што зарабілі адзін бал.

Як гулялі сапернікі беларусаў?

Група С. Іспанія — Македонія — 5:1, Украіна — Славакія — 0:1.

Тарас ШЧЫРЫ.

■ На адлегласці

ПАКУЛЬ ЁСЦЬ ШАНС

Змяніць жыццё не позна ў любым узросце

У большасці суайчыннікаў папраўчыя ўстановы асацыююцца з калючым дротам вышкай, таблічкамі: «Стой, забараняльная зона!», ахоўнікамі і вартавымі сабакамі. Шчыра прызнацца, так думала і я. Да пэўнага часу…

У раёне аэрапорта «Мінск-1», на вуліцы Караткевіча, знаходзіцца будынак, які нічым не адрозніваецца ад іншых. Адразу і не здагадаешся, што гэта папраўчая ўстанова адкрытага тыпу № 51 Дэпартамента выканання пакаранняў МУС Беларусі па Мінску і Мінскай вобласці.

У ліку іншых катэгорый асуджаных тут адбываюць часовае пакаранне і абавязаныя асобы — пазбаўленыя бацькоўскіх правоў жанчыны, якія павінны кампенсаваць дзяржаве расходы за выхаванне іх дзяцей. **Начальнік атрада маёр міліцыі Галіна ВАСІЛЕЦ** пагадзілася правесці экскурсію, пазнаёміць са сваімі падапечнымі.

ЯК У ЗВЫЧАЙНЫМ ІНТЭРНАЦЕ

Жывуць асуджаныя ў пакоях, ці як іх тут называюць, секцыях, па восем чалавек у кожнай. Акрамя таго, яшчэ адна, значна большая па плошчы, разлічаная на 15 насельнікаў. Спальныя ложкі ў два ярусы, ёсць тумбачкі, табурэткі, халадзільнік, убудаваныя ў сцяну шафы. Словам, у наяўнасці ўвесь неабходны для паўсядзённага побыту мінімум. У некаторых пакоях — тэлевізар. Яго асуджаным можна прывезці з дому толькі па пісьмовай заяве, з дазволу адміністрацыі ўстановы. У пакоях чыста, светла, акуратна, на падаконніках — кветкі. Жанчына, дзе б ні знаходзілася, імкнецца стварыць вакол сябе ўтульнасць, камфорт.

На гэтым жа паверсе кухня, абсталяваная газавымі плітамі, сталамі. Над каструляй завіхаецца маладая жанчына.

— У кожнай з нас свой посуд. Нехта гатуе для сябе сам са сваіх прадуктаў, а іншыя кааперуюцца з суседкамі. Так зручней. Хто першы прыйшоў са змены — той і кухарыць, — распавяла Аксана. — А наогул, мы жывём дружна, стараемся падтрымліваць адна адну.

Калі б не ведала, дзе знаходжуся, то сказала б: у звычайным рабочым інтэрнаце. Адно, бадай, адрозненне ў тым, што жыццё тут падпарадкавана дысцыпліне і строгаму распарадку. Адбой у 22 гадзіны, пад'ём а 6-й раніцы, умыванне, снеданне, прыборка памяшканняў, месцаў агульнага карыстання і ад'езд на работу.

ВЫХАВАННЕ ПРАЦАЙ

— У нас заключаны дагаворы з Мінскім аўтамабільным заводам і кампаніяй «Смалявічы Бройлер». На змену дастаўляем жанчын арганізавана, аўтобусам, — расказвае Галіна Уладзіміраўна. — На птушкафабрыцы нашы падапечныя зарабляюць у сярэднім па 8 млн рублёў штомесяц. А тыя, хто працуе ў пазаўрочны час і ў выхадныя, яшчэ больш — да 15 млн рублёў. Менавіта таму жанчыны маюць магчымасць разлічыцца па запазычанасці, а некаторыя — і аднавіць свае правы на дзяцей, якія знаходзяцца пад апекай дзяржавы ці сваякоў. Напрыклад, сёлета адна з асуджаных, якая вызвалілася датэрмінова, разлічылася з дзяржавай і вярнула сваіх дзяцей. Жанчына не захацела сыходзіць з МАЗа, працуе там да гэтага часу. У Смалявічах пасля вызвалення асуджаных, як правіла, з птушкафабрыкі звальняюць, дык яны просяць іх пакінуць, бо там вельмі добрыя заробкі.

Пад кантролем супрацоўнікаў папраўчай установы гэтыя работніцы працуюць добра, на работу з'яўляюцца без спазненняў, не парушаюць дысцыпліну. Але дзе гарантыя, што пасля заканчэння тэрміну зняволення не сарвуцца?..

— Акрамя таго, нам штомесяц дадаткова выдзяляюць 300 тыс. рублёў на пакупку прадуктаў харчавання ў фірмавай краме птушкафабрыкі, — дадае старэйшая па секцыі Вольга. — На прадпрыемстве таксама даступная па цэнах сталовая. Вядома, хацелася б застацца на фабрыцы і пасля вызвалення. На волі цяжка знайсці працу з добрымі заробкамі.

Сапраўды, жанчыны, што адбываюць пакаранне, пераважна маюць сярэднюю, а то і незакончаную сярэднюю адукацыю. Ім, як правіла, пасля выхаду з установы прапаноўваюць работу прыбіральшчыцы, дворніка, гардэробшчыцы. Але і кіраўніцтва прадпрыемства зразумець можна. Пад кантролем супрацоўнікаў папраўчай установы гэтыя работніцы працуюць добра, на работу з'яўляюцца без спазненняў, не парушаюць дысцыпліну. Але дзе гарантыя, што пасля заканчэння тэрміну зняволення не сарвуцца?.. Такія выпадкі не рэдкасць.

КАБ МАМА БЫЛА ПОБАЧ

— Не выключана такая небяспека, што пасля выхаду на волю яны зноў трапяць у кампанію былых сяброў. І ў гэтым не толькі іх віна, — канстатуе Галіна Васілец. — Нярэдкія выпадкі, калі ў асуджаных ёсць куды вярнуцца, ды родныя катэгарычна супраць, каб яны жылі разам з імі пад адным дахам. А тым, хто спатыкнуўся, але хоча памяняць сваё жыццё, вельмі патрэбна маральная падтрымка, узаемаразуменне блізкіх людзей. У адваротным выпадку чалавек можа зноў пакаціцца па нахіленай. Некаторыя наогул баяцца волі, баяцца быць нікому не патрэбнымі і нават не хочуць пакідаць сцены ўстановы. Мы ў сваю чаргу перад заканчэннем тэрміну пакарання высвятляем праз участковага міліцыянера, сацыяльныя службы, ці ёсць асуджанай куды вярнуцца, ці ёсць жыллё.

Разам з тым многія жанчыны ўпэўнены, што іх чакаюць дома і бацькі, і дзеці.

— Мне 31 год, але ж мне хочацца, каб мама была побач. А мае ж дзеткі яшчэ зусім маленькія і маюць яшчэ большую патрэбу ў маіх пяшчоце і дапамозе, — гаворыць адна з асуджаных. — Я маю намер разлічыцца з запазычанасцю, з чыстым сумленнем выйсці на волю і вярнуць свае бацькоўскія правы.

У другой трое непаўналетніх дзяцей: старэйшай дзяўчынцы — 10, малодшай — 6. Яны жывуць дома, пад апекай бабы і дзеда.

— Не магу паскардзіцца, бо тут ёсць усё неабходнае для жыцця. Але ж лепш сюды не трапляць — псіхалагічна цяжка без дзяцей, хочацца быць побач з імі, але разумееш, што гэта немагчыма. Выйду на волю — уладкуюся на працу. І думаю, што ў далейшым у нас будзе ўсё добра, — упэўнена маці.

Адразу відаць, што яна сумуе па сваіх малых. Акрамя абавязковых адлічэнняў, штомесяц адпраўляе дзецям грашовыя пераводы, не парушае дысцыпліну, удзельнічае ў грамадскім жыцці. За прыкладныя паводзіны яе заахвочваюць, дазваляюць наведваць сваіх дачок.

Жыццё тут падпарадкавана дысцыпліне і строгаму распарадку. Адбой у 22 гадзіны, пад'ём а 6-й раніцы, умыванне, снеданне, прыборка памяшканняў, месцаў агульнага карыстання і ад'езд на работу.

Менавіта ў папраўчай установе некаторыя жанчыны адчулі сябе жанчынамі. Папрыгажэлі, пасвятлелі тварам, бо не ўжываюць спіртнога, сочаць за сабой, карыстаюцца касметыкай. Некаторыя з іх упершыню пабывалі ў музеях, на выставах, экскурсіях, якія для іх арганізуе кіраўніцтва ўстановы. Бо на волі было не да гэтага: алкаголь, сумніўныя кампаніі… У многіх тут праявіліся творчыя здольнасці: пішуць вершы, дасылаюць іх у газеты і часопісы, малююць. Усе ахвотныя займаюцца спортам: чаму б і не, калі ёсць спартыўная зала, тэнісны стол, адпаведныя секцыі.

Дапамагае жанчынам захаваць сябе як асобу і вера. Кіраўніцтва калоніі наладзіла сувязі з праваслаўнай царквой. Святары наведваюць асуджаных, праводзяць з імі духоўныя гутаркі. У сваю чаргу жанчыны ходзяць у царкву, а таксама прыбіраюць могілкі. Тым, хто хоча вылечыцца ад алкагалізму, таксама ідуць насустрач. Па дамове з урачамі наркадыспансера іх бясплатна кадзіруюць. Але, бясспрэчна, на добраахвотнай аснове. Трымаюць тут сувязь з таварыствам ананімных алкаголікаў. Яго прадстаўнікі прыходзяць у папраўчую ўстанову, сустракаюцца з тымі, хто развіваўся з заганнай звычкай або толькі хоча стаць на цвярозы шлях. Лечаць у «калоніі» не толькі душу, але і цела. Асуджаныя замацаваны за 38-й паліклінікай. Хворым тут і бюлетэнь выпішуць, і працэдуры прызначаць. А калі вельмі «прыціснула», то і ў стацыянар пакладуць. Вядома ж — пад строгім кантролем супрацоўнікаў установы.

На кухні.

Ужо на выхадзе прыкмеціла на сцяне маляўнічы плакат.

— Гэта насценная газета. Яе выпускае рэдкалегія, — перахапіла мой погляд Галіна Васілец. — Вывешваем мы яшчэ і бюлетэнь з прозвішчамі парушальнікаў дысцыпліны. На жаль, ёсць і такія. Вельмі хацелася б, каб яны спыніліся, асэнсавалі свае паводзіны, а пасля адбыцця тэрміну пакарання паклапаціліся пра сваіх дзяцей. Таму змагаемся за кожную…

Сапраўды, змяніць сваё жыццё ніколі не позна. У любым узросце.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ

Падчас паверкі.

Фотаздымкі Сяргея НІКАНОВІЧА.

ЦЯЖКІ ПАЧАТАК

Завяршылася першая выязная серыя мінскага «Дынама» ў новым сезоне КХЛ

З дзевяці магчымых ачкоў беларускія «зубры» ўзялі толькі два. Першым сапернікам у новым сезоне для мінчан стаў фінскі «Ёкерыт», дэбютантаў КХЛ нашы хакеісты абыграліў авертайме 4:5. Сапраўдным героем паядынку стаў навічок «Дынама» Джонатан Чычу: ён закінуў тры шайбы і аддаў дзве галявыя перадачы. Вырашальны гол у вароты «Ёкерыта» ў дадатковы час забіў яшчэ адзін дынамаўскі легіянер Мэт Элісан. Каманда паказала добрую гульню, асабліва ў няроўных складах, што і адзначыў пасля матча **галоўны трэнер «зуброў» Любамір ПОКАВІЧ.**

— Пачатак аказаўся вельмі цяжкім: дзве меншасці запар, у адной з якіх мы прапусцілі гол. Але мы ўсё роўна чапляліся да канца. Перш за ўсё, нам дапамагла наша большасць. У канцы ў авертайме ў саперніка быў шанс усё вырашыць, калі гаспадары мелі перавагу. Але потым на аднаго гульца болей было ў нас, і мы вырашылі выхад сустрэчы.

Наступны прыпынак мінчан адбыўся ў Рызе. На лёд з мясцовым «Дынама» выйшаў наш капітан Аляксей Калюжны, які аднавіўся пасля складанай аперацыі. Паядынак атрымаўся роўны, абедзве каманды мелі шмат галявых момантаў, аднак рыжане рэалізавалі іх лепш, таму і перамаглі з лікам 4:2. На лёдзе ў складзе мінскага «Дынама» зноў саліравалі легіянеры, шайбы ў вароты рыжан закінулі Джонатан Чычу і Пол Шчэхура. Лідар «зуброў» **Джонатан ЧЫЧУ быў прызнаны лепшым нападаючым першага тыдня КХЛ.**

— Дзіўны матч. Быццам бы пачалі добра, закінулі, вялі ўліку. Гулялі выдатна, але затым пачалі зарабляць выдаленні, і гаспадары скарысталіся большасцю. Другі гол рыжан стаў для іх самым важным, але ключавую ролю, лічу, адыгралі гэтыя самыя выдаленні. Яны надалі сапернікуімпульс, і рыжане закінулі пару шайбаў. Наогул, лічу, у стартавых матчах «Дынама» глядзелася добра. Цяжка супрацьстаяць камандам, якія праводзяць першыя хатнія матчы сезона — гэта дае сапернікам дадатковую энергію. У стартавых перыядах абедзвюх сустрэч гулялі ўпэўнена. У Хельсінкі выдатна выступілі ў большасці, таму і перамаглі. А ў Рызе ў колькаснай перавазе паспяхова дзейнічалі гаспадары. Часам вырашальнымі аказваюцца менавіта такія фактары, — адзначыў Джонатан Чычу.

Апошні паядынак першай выязной серыі хакеісты мінскага «Дынама» правялі з піцерскім СКА. У гэтым матчы сваё слова нарэшце сказалі і беларускія гульцы. У КХЛ за «Дынама» дэбютаваў Арцём Волкаў, вароты выдатна абараняў Дзмітрый Мільчакоў, а шайбы на рахунку Дзмітрыя Мялешкі і Артура Гаўруса. Аднак гэта не дапамагло зарабіць мінчанам яшчэ тры ачкі. Пры ліку 3:2 на карысць піцерцаў Любамір Покавіч зняў варатара, што дазволіла гаспадарам закінуць яшчэ дзве шайбы. Часу на тое, каб адыгрыцца, ужо не заставалася.

— Думаю, што гульня была цікавая не толькі для заўзятараў, але і для камандаў. Вынік доўга быў роўным, мы да апошніх секундаў спрабавалі зраўняць. У нас было некалькі вельмі добрых момантаў, нават у пустыя маглі забіць, але не атрымалася. Мы рыхтаваліся да гульні ўшасцёх у канцы матча, у нас было некалькі добрых момантаў, калі завяршалі камбінацыю кідком, два разы амаль пацэлілі, але не атрымалася ў выніку, — адзначыў Покавіч.

Наступныя матчы «Дынама» правядзе ў Мінску: 12 верасня нашы хакеісты сустрэнуцца з «Атлантам», 14-га — з ЦСКА, 18-га — з «Поўначсталлю»; завершаць хатнюю серыю мінчане гульнёй супраць «Тарпеда» з Ніжняга Ноўгарада.

Як праявілі сябе іншыя беларусы ў першы тыдзень новага сезона КХЛ

Андрэй Сцяпанаў стаў аўтарам першага беларускага гола ў новым сезоне КХЛ, пазней яго ж шайба дапамагла «Нафтахіміку» перамагчы «Трактар».

Андрэй Стась у гульні супраць «Дынама» з Масквы каньком адправіў шайбу ў вароты свайго армейскага клуба.

Джэф Плат закінуў дзве шайбы і аддаў галявы пас у гульні з рыжскім «Дынама», што дапамагло «Лакаматыву» перамагчы.

Дзве шайбы **Андрэя Касціцына** дапамаглі «Трактару» абыграць «Тарпеда».

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.